Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце БДУКМ
_______________ В.Р. Языковіч
“_12_” ______01______2021 г.
Рэгістрацыйны № ВД - 138 /эвуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВАКАЛЬНЫ АНСАМБЛЬ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках), напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-21 Спевы (народныя)*

2021

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-16 01 10-2013, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці. Рэгістрацыйны нумар С 16-1-113/19 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*Л.В. Снапкова,* дацэнт кафедры белорускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»;

*В.І. Раманенкава*, старшы выкладчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат мастацтвазнаўства.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

А.Я. Цэхавая, старшыня цыклавой камісіі "Народная творчасць (харавая музыка народная)" установы адукацыі "Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў";

*В.В. Калацэй,* загадчык кафедры этналогіі і фальклору ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў", кандыдат культуралогіі, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці (пратакол № 7 ад 25.02.2020 г.);

навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі "Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў" (пратакол № 2 ад 09.12.2020 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Вакальны ансамбль” з’яўляецца адной з асноўных у падрыхтоўцы будучых выканаўцаў народнай песні.

Асноўнымі кірункамі ў авалоданні ведамі па вучэбнай дысцыпліне “Вакальны ансамбль” з’яўляюцца: засваенне рэгіянальных пеўчых стыляў, глыбокае пранікненне ў выканальніцкую традыцыю як мясцовую, так і гарадскую. Эфектыўнасць выкладання вучэбнай дысцыпліны ажыццяўляецца ва ўзаемадзеянні з такімі вучэбнымі дысцыплінамі, як “Выканальніцкае майстэрства”, “Аранжыроўка і расшыфроўка народнай песні”, “Асновы сцэнічнага руху”, “Методыцы выкладання спецдысцыплін”, “Гісторыя вакальнага мастацтва”, “Беларуская народна-песенная творчасць”.

Спевы ў ансамблі маюць сваю спецыфіку, якая зыходзіць з асаблівасцяў творчага працэсу жанру. Фактам, які вызначае выканальніцкую спецыфіку вакальнага ансамбля, з’яўляецца творчае адзінства індывідуальнага і калектыўнага пачатку ў спевах. Гэта патрабуе ад спевака-ансамбліста павышаную адказнасць за ўзровень свайго майстэрства, бо ў адрозненні ад харыстаў, удзельнікі ансамбля выконваюць сваю партыю ў шматгалоссі самастойна.

Вучэбная дысцыпліна “Вакальны ансамбль” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных груп кампетэнцый:

АК-1. Умець прымяняць атрыманыя навукова-тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці выканаўцы і выкладчыка для вырашэння прафесійных задач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-13. Арыентавацца ў спецыфічных актуальных працэсах, якія адбываюцца ў музычным мастацтве.

АК-14. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-16. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і працай з кампутарам.

АК-19. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць рашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навуковай дзейнасці.

СЛК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці, развітым пачуццём патрыятызму.

СЛК-2. Валодаць высокай духоўнасцю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СЛК-3. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння на аснове прынятых маральных і прававых нормаў, дэманструючы павагу і талерантнасць да іншай культуры.

СЛК-5. Валодаць навыкамі здароўезберажэння.

СЛК-6. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

СЛК-8. Валодаць верай у сябе, у свае сілы і здольнасці, у сваё пакліканне, у правільнасць выбару жыццёвага шляху.

СЛК-9. Аргументавана адстойваць асабістую пазіцыю ў дачыненні да сучасных працэсаў у галіне музычнага мастацтва.

СЛК-10. Актыўна ўдзельнічаць у творчых мерапрыемствах.

ПК-1. Прафесійна спяваць, артыстычна рухацца.

ПК-2. Ствараць мастацкую інтэрпрэтацыю музычнага твора, валодаць ведамі заканамернасцяў метадаў працы над вакальным творам, падрыхтоўкі да публічнага выступлення.

ПК-4. Публічна выконваць самастойна падабраны і вывучаны рэпертуар, які ўключае творы розных эпох, жанраў і стыляў, фарміраваць канцэртную праграму.

ПК-5. Сістэматычна працаваць над ростам выканальніцкага майстэрства.

ПК-9. Выкладаць спецыяльныя дысцыпліны для розных узроставых катэгорый, якія навучаюцца на ўзроўні, адпаведным патрабаванням сучаснага вакальнага мастацтва, пастаянна вывучаючы перадавы педагагічны і выканальніцкі вопыт і творча яго выкарыстоўваючы.

ПК-10. Прымяняць метады псіхолага-педагагічных навук і вынікі даследаванняў у галіне агульнай і музычнай педагогікі ў сваёй дзейнасці, улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэтаў і задач навучання і выхавання.

ПК-11. Выкарыстоўваць сучасныя методыкі і адукацыйныя тэхналогіі для выбару аптымальнай стратэгіі навучання. Прымяняць інавацыйныя тэхналогіі навучання, мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі, фоназапісы.

ПК-18. Арганізоўваць працу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах вывучэння і захавання народна-песенных традыцый.

ПК-19. Удзельнічаць у культурным жыцці грамадства, ствараючы творчае і адукацыйнае асяроддзе з мэтай папулярызацыі музычнага мастацтва ў шырокіх колах грамадства.

ПК-22. Распрацоўваць і рэалізоўваць уласныя і (або) сумесныя з музыкамі-выканаўцамі іншых адукацыйных арганізацый і ўстаноў культуры

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

асветніцкія праекты, у тым ліку, і з выкарыстаннем магчымасцяў радыё, тэлебачання, інтэрнэту.

ПК-23. Арганізоўваць гастрольна-канцэртную дзейнасць творчых калектываў і салістаў, весці перамовы па арганізацыі выканальніцкай дзейнасці.

ПК-31. Аналізаваць сучасны стан, перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народна-песеннай творчасці.

ПК-32. Ажыццяўляць нагляд за ўмовамі бытавання розных відаў і жанраў песеннага фальклору з мэтай яго аховы і пераемнасці.

Мэта вучэбнай дысцыпліны “ Вакальны ансамбль” – даць будучаму спецыялісту неабходныя веды па засваенні традыцыйнай і сцэнічнай манер народных ансамблевых спеваў, па авалоданні навыкамі і ўменнямі раскрыцця вобраза народнай песні, выхаваць высокаадукаванага спецыяліста ў сферы народна-песеннага выканальніцтва.

Задачы вучэбнай дысцыпліны:

- авалодаць практычнымі навыкамі і ўменнямі спеваў у ансамблі;
- сфарміраваць і развіць навыкі і ўменні выразных сцэнічных паводзін і акцёрскага майстэрства;
- прымяняць спецыфічныя прыёмы гуказдабывання ва ўмовах ансамблевых спеваў;
- авалодаць методыкай работы з вакальным ансамблем у працэсе практычнай работы з вучэбным калектывам;
- выхаваць выразна-асэнсаванае гукаўтварэнне праз размоўную манеру спеваў;
- засвоіць вакальную тэхніку і прымяняць яе пры раскрыцці мастацкага вобраза народнай песні;
- атрымаць трывалыя веды па пытаннях вакальнай работы ў калектыве;
- сфарміраваць у будучых спецыялістаў мастацка-каштоўнасную арыентацыю па авалоданні прынцыпамі падбору рэпертуару і ўменні максімальна выкарыстоўваць яго ў выхаваўчай і педагагічнай рабоце.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны “Вакальны ансамбль” студэнт павінен *ведаць:*

- прынцыпы работы з вакальным ансамблем;
- спосабы роўнага і плаўнага гукавядзення;
- народную мелізматыку (прыдыхі, спады голасу, фаршлагі і г.д.);
- выканальніцкія асаблівасці розных этнаграфичных рэгіёнаў Беларусі;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*умець:*

- сфарміраваць рэпертуар для вакальнага ансамбля;
- развіваць вакальна-тэхнічныя навыкі і ўменні, шукаць сваё выканальніцкае крэда;
- фарміраваць і выхоўваць творчую асобу;

*валодаць:*

- тэхнікай правільнага пеўчага дыхання;
- аўтэнтычнай і стылізаванай манерай выканання народных песен;
- прыёмамі дыкцыі і артыкуляцыі згодна з нормамі арфаэпіі беларускай мовы і рэгіянальных дыялектаў Беларусі.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Вакальны ансамбль” адведзена ўсяго 296 гадзіны, з іх 124 гадзін – аўдыторныя заняткі (індывідуальныя).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залікі, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме гуманітарнай адукацыі па спецыяльнасці "Спевы" (народныя). Міждысцыплінарныя сувязі ў галіне фалькларыстыкі, этнафоназнаўства, музыкалогіі.

Значэнне вучэбнай дысцыпліны "Вакальны ансамбль" у агульнай сістэме практыка-арыентаваных музычных дысцыплін.

Асноўныя кірункі выканальніцкага майстэрства, якія выкарыстоўвае вучэбная дысцыпліна "Вакальны ансамбль" пры выпрацоўцы вакальна-тэхнічных і сцэнічна-вобразных навыкаў.

Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прадмет вучэбнай дысцыпліны. Структура вучэбнай дысцыпліны. Крыніцы і літаратура.

## *Тэма 1. Тэхніка спеваў у вакальным ансамблі (гукаўтварэнне, кантыленнае гукавядзенне, адзіная манера спеваў, пеўчае дыханне)*

Замацаванне навыкаў, якія засвоілі на сольных спевах і авалоданне новымі: выкананне ў аднародных і змешаных складах ансамбляў, пашырэнне дыяпазону ва ўмовах ансамблевых спеваў з выкарыстаннем нюансаў мэца фортэ і мэца піяна. Адзіная манера спеваў, апора на размоўны пасыл слова і гука. Моўныя інтанацыі і выканальніцкія прыёмы. Жанравая разнастайнасць беларускай народнай песні і яе ўплыў на народную манеру выканання. Гукаўтварэнне пры спевах каляндарна-абрадавых песен. Асаблівасці гукавядзення ў веснавых загуканнях і веснавых карагодных песнях. Работа над пеўчым дыханнем "на апоры", звязанае з тэмпам твора, які выконваецца. Работа над спосабымі здабывання правільнай песеннай пазіцыі пры гукаўтварэнні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 2. Пеўчая дыкцыя (нейтралізацыя галосных, работа над галоснымі і зычнымі)*

Выразнае вымаўленне тэксту, як адзін з самых важных сродкаў народна-выканальніцкага майстэрства. Праца над дакладнай дыкцыяй для ўвасаблення тэксту песні, апора на лагічныя націскі і данясенне сэнсу песні да слухача. Нейтралізацыя галосных – аснова работы над адзінай манерай выканання. Дыкцыя – галоўны сродак данясення тэксту твора і важны сродак раскрыцця мастацкага вобраза. Тэхніка ўтварэння галосных і зычных гукаў у спевах. Цэласны размоўны спосаб спеваў. Практыкаванні для ўдасканалення і выпраўлення дыкцыі і артыкуляцыі.

### *Тэма 3. Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі ў вакальным ансамблі (ансамбль і строй)*

Адзіная манера гукаўтварэння – неабходная ўмова дасягнення ўстойлівасці інтанацыі і чысціні строю. Фарміраванне вакальна-тэхнічных навыкаў у цеснай сувязі з развіццём музычнага слыху. Сувязь тэхнічных і мастацкіх бакоў выканання. Уменне спяваць свабодна, без напружання. Выяўленне індывідуальных недахопаў і шляхоў іх пераадолення. Складанасць работы пры выпрацоўцы навыкаў інтанавання ў спецыфічных ладах народнай музыкі і выкананні дыссанантных сугуччаў, якія ўзнікаюць дзякуючы лінеарнай імправізацыйнасці развіцця галасоў. Асэнсаванае інтанаванне музычна-паэтычнага тэксту твора. Спевы народных песень у аднагалосным і шматгалосным выкананні. Знаёмства з рознымі відамі і тыпамі ансамбляў.

### *Тэма 4. Рэгістравая палітра ансамблевага гучання (грудное, галаўное, змешанае, згладжванне рэгістравых пераходаў)*

Вольнае валоданне ўсімі рэгістрамі голасу. Замацаванне груднога гучання ў межах сэптымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў. Авалоданне навыкамі галаўнога і змешанага рэгістраў, сгладжванне трох рэгістраў. Выкарыстанне аднарэгістравых і двухрэгістравых партытур. Пашырэнне дыяпазону галасоў за кошт згладжвання рэгістраў пры захаванні тэмбравай яркасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 5. Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння (асаблівасці дыялектаў)*

Знаёмства з асаблівасцямі дыялекту. Засваенне дыялектных асаблівасцяў рэгёнаў Беларусі: Паазер’е, Панямонне, Падняпроў’е, Палессе, Цэнтральная Беларусь. Вывучэнне спецыфікі вымаўлення і манеры выканання на прыкладах рэгіянальных неапрацаваных народных песень. Засваенне рэгіянальных прыёмаў гукаўтварэння: рэдуцыраванне галосных, расцягванне слоў на дадатковыя галосныя, паўторнасць складоў, арнаментыкі: слізганняў, прыгукаў, народных мелізмаў і мардэнтаў, глісандыруючых гукаў, спадаў, абрываў слоў і інш.

### *Тэма 6. Аўтэнтычная народная манера спеваў*

Знаёмства з аўтэнтычнай манерай спеваў. Ужыванне спецыяльных практыкаванняў для выпрацоўкі правільнага гукаўтварэння. Набыццё навыкаў і ўменняў спеваў аўтэнтычнага фальклору з захаваннем рэгіянальнай манеры выканання. Праслухоўванне фальклорна-этнаграфічнага матэрыялу з мэтай яго засваення і ўзнаўлення. Праца над прыёмамі традыцыйнага народнага выканальніцтва – народнымі мелізмамі (фаршлагамі, глісанда, скідамі, закідванне голасу ўгару, гуканнямі, агласоўкамі зычных і інш.). Авалоданне мастацтвам спеваў без суправаджэння ў аўтэнтычнай манеры.

### *Тэма 7. Сцэнічная народная манера спеваў*

Авалоданне на матэрыяле беларускіх народных песень сцэнічнай манерай народных спеваў. Спевы прыкрытым і паўпрыкрытым, акругленным гукам. Выпрацоўка адзінай манеры ансамблевага выканання. Праца над свабоднай артыкуляцыяй і дакладнай дыкцыяй. Літаратурнае вымаўленне тэксту народнай песні. Ансамблевае выкананне без суправаджэння і спевы з рознымі відамі суправаджэння (аркестравае, фанаграма -1). Выкарыстанне танцавальных рухаў у вакальным ансамблі. Прыёмы выкарыстання народнай харэаграфіі і пластыкі ў пастаноўцы лірычнай народнай песні і карагодаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 8. Музычна-выразныя сродкі і праца над стварэннем мастацкага вобразу народнай песні*

Практыкаванні па выпрацоўцы розных відаў гукавядзення. Метрарытм і тэмп. Тэмбравыя фарбы і іх уплыў на стварэнне мастацкага вобразу песні. Дынаміка, асноўныя дынамічныя адценні і праца над імі. Фразіроўка і яе залежнасць ад тэксту твора. Музычна-вобразнае мысленне.

### *Тэма 9. Авалоданне навыкамі імправізацыі ў вакальным ансамблі*

Асновы імправізацыі. Развіццё пеўчых навыкаў імправізацыі. Уменне выкарыстоўваць варыянтнасць у незафіксаванай паслядоўнасці строф этнаграфічнага шматгалосся. Праца над авалоданнем складанымі навыкамі імправізацыі. Пабудова на аснове вывучаемага песеннага матэрыялу варыянтаў ніжняга, сярэдняга і верхняга голасу. Выхаванне ансамблевай выканальніцкай культуры: прыпяванне, пабудова падгалоскаў да асноўнага напеву і інш.

### *Тэма 10. Авалоданне асновамі спеваў з элементамі руху*

Знаёмства з асноўнымі элементамі народнай харэаграфіі. Авалоданне навыкамі і ўменнямі выкарыстання танцавальных рухаў у вакальным ансамблі. Работа над элементамі народнага танца ў песнях з рухам: просты і пераменны шаг, просты і трайны прытопы, шаг з прытопам, дробная сцежка, спалучэнне розных рытмаў пры выкананні адной песні. Рух “сценка на сценку”, па колу, змейка, закручванне, смаўжок і інш.

Каардынацыя ўнутраных эмацыянальных пачуццяў са знешнімі (мімікай, выразнасцю рухаў, узаемадзеяннем у працэсе выканання). Сцэнічная інтэрпрэтацыя харэаграфічнага фальклору.

### *Тэма 11. Удасканаленне навыкаў народнай манеры спеваў у вакальным ансамблі*

Замацаванне і развіццё навыкаў і ўменняў, набытых раней, на новым матэрыяле песенна-танцавальнай традыцыі, апрацовак беларускіх народных песень. Спевы ў вакальным ансамблі больш складаных партытур з авалоданнем адзінай манеры гукаўтварэння. Праца над вакальнай тэхнікай складаных вакальных твораў. Авалодванне навыкамі выканання аўтарскіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

твораў. Выпрацоўка навыкаў тэхнікі філіроўкі гуку. Развіццё гібкасці, рухомасці і палётнасці голасу.

### *Тэма 12. Актыўны ўдзел у канцэртах, авалоданне выканальніцкім майстэрствам*

Удасканаленне выканальніцкага майстэрства студэнта. Актыўная канцэртная дзейнасць. Удзел у конкурсах і фестывалях. Выкарыстанне ў сваёй творчай дзейнасці разнастайнага музычна-стылістычнага матэрыялу. Праяўленне тонкага музычнага і мастацкага густу ў выкананні народнай песні – патрабуецца ад будучага спецыяліста ў галіне народных спеваў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назвы тэм | | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Індывід. заняткі | КСР | Форма кантролю |
| 1 | Уводзіны | | 2 | | |
| 2 | ***Тэма 1.*** Тэхніка спеваў у вакальным ансамблі (гукаўтварэнне, кантыленнае гукавядзенне, адзіная манера спеваў, пеўчае дыханне) | | 8 | | |
| 3 | ***Тэма 2.*** Пеўчая дыкцыя (нейтралізацыя галосных, работа над галоснымі і зычнымі) | | 8 | 2 | паказ на ўроку |
| 4 | ***Тэма 3.*** Выпрацоўка чыстай і дакладнай інтанацыі ў вакальным ансамблі (ансамбль і строй) | | 8 | 2 | праслухоўванне аўдыёзапісаў |
| 5 | ***Тэма 4.*** Рэгістравая палітра ансамблевага гучання (грудное, галаўное, змешанае, згладжванне рэгістравых пераходаў) | | 8 | 2 | рэферат |
| 6 | ***Тэма 5.*** Засваенне рэгіянальных прыёмаў народнага гукаўтварэння (асаблівасці дыялектаў) | | 6 | 4 | залік |
| 7 | ***Тэма 6.*** Аўтэнтычная народная манера спеваў | | 8 | | |
| 8 | ***Тэма 7.*** Сцэнічная народная манера спеваў | | 8 | | |
| 9 | ***Тэма 8.*** Музычна-выразныя сродкі і праца над стварэннем мастацкага | | 10 | 4 | экзамен |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | вобразу беларускай народнай песні | | | | |
| 10 | ***Тэма 9.*** Авалоданне навыкамі імправізацыі ў вакальным ансамблі | | 6 | | |
| 11 | ***Тэма10.*** Авалоданне асновамі спеваў з элементамі руху | | 8 | 2 | вуснае апытанне |
| 12 | ***Тэма 11.*** Удасканаленне навыкаў народнай манеры спеваў у вакальным ансамблі | | 10 | 4 | сцэнарны-план |
| 13 | ***Тэма 12***. Актыўны ўдзел у канцэртах, авалоданне выканальніцкім майстэрствам | | 14 | | канцэрт-экзамен |
| | Усяго: | | 104 | 20 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн: Універсітэтскае, 1989. – с.128-320.
2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова. – Мн: Універсітэтскае, 1995. – с. 100-250.
3. *Варфаламеева*, Т.Б. Песні Беларускага Панямоння / Т.Б. Варфаламеева. – Мн: Бел. Навука, 1980. – 220 с.
4. *Вянок* беларускіх народных песень / запіс у Раговіча. – Мн: Навука і тэхніка, 1988. – 432 с..
5. *Дарога* ля жыта: песні бел. кампазітараў на вершы В.А. Жуковіча / укл. В.А. Жуковіч. – Мн.: Беларусь, 2001. – 144 с.
6. *Жніўныя* песні / рэд. А.С.Фядосік. – Мн: Навука і тэхніка, 1974. – с. 120–340.
7. *Кузняцоў, І.І.* Звіняць над краем песні / І.І. Кузняцоў. – Мн.: Беларусь, 1979. – 79 с.
8. *Купальскі спеўнік* : метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А. Пладунова. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с.
9. *Мажэйка*, З Я Песні Беларускага Паазер'я / З.Я. Мажэйка. – Мн: Навука і тэхніка, 1981. – с. 80–120; с. 300–480.
10. *Мажэйка,* З.Я. Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мн: Бел. навука,1999. – 276 с.
11. *Можейко*, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М.: Сов.композитор, 1983. – Вып 1. – 184 с.
12. *Можейко*, З.Я. Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М.: Сов. Композитор, 1984. – Вып.2. – 181 с.
13. *Можейко*, З.Я. Песенная культура Белорусского Полесья. Село Тонеж. – Мн.: Наука и техника, 1971. – 263 с.
14. *Равенскі, М.* Збор твораў : Беларускія народныя песні / Мікола Равенскі; рэдкал.: І. Алоўнікаў [і. інш.]. – Мінск: Тэхналогія, 2008. – 191 с.
15. *Раговіч, У.І.* Песенны фальклор Палесся. Песні святочнага календара / У.І. Раговіч. – Мн.: Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1. – 526 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

16. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.
17. *У карагодзе* мы былі. Беларускія народныя танцавальныя песні / укл. М.А. Козенка. – Мн., 1988. – 112 с.
18. *Цітавец, І.* Ёсць любоў у мяне…: Зб. песень. –Мн.: Рэд.часоп. "Адукацыя і выхаванне", 1999. – 321 с.
19. *Чырвоная каліна* : зборнік твораў самадзейных кампазітараў Брэстчыны : у дапамогу кіраўнікам вакальна-харавых калектываў / уклад. М. Дз. Аласюк [і інш.]. – Брэст : Альтэрнатыва, 2012. – 48 с.

20. *Эвальд,* З.В. Песни Белорусского Полесья. – М.: Сов.композитор, 1979. – 120 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбна-метадычная*

1. *Грамовіч*, І.М. Методыка работы з фальклорным гуртам: курс лекцый/ І.М. Грамовіч, Л.В. Снапкова.—Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. 2009. – 139 с.
2. *Дмитриев*, Л.Б. Основы вокальной методики / Л.Б. Дмитриев. – М.: Музыка, 2000. – 367 с.
3. *Калугина*, Н.В Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. Вузов / Н.В. Калугина, - М.: Музыка,1977. – 71 с.
4. *Малышева,* Н.М. О пении / Н.М. Малышева. – М.: Сов. Композитор, 1988. – 135с.
5. *Мешко*, Н.К. Искусство народного пения: практическое руководство и методика обучения искусству народного пения / Н.К. Мешко. – М.: ЛУЧ, 2000. – 80 с.
6. *Менабени*, А.Г. Методика обучения сольному пению: Учебное пособие для пед. ин-тов. – М.: Просвещение, 1987. – 93с.
7. *Огороднов*, Д.Е. Воспитание певца в самодеятельном ансамбле. – Киев: Муз Украина, 1980. – 66 с.

*Дадатковая*

1. *Крывіцкі,* А.А. Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / Т-ва па распаўсюджванні паліт. І навук. ведаў БССР. – Мн., 1961. 40 с.
2. *Несцяровіч, Г.Д., Холупава, Л.І., Дубавец. А.І.* Ансамбль беларускай народнай песні: вучэб.дапам./ Г.Д. Несцяровіч, Л.І. Холупава, А.І. Дубавец. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2006 – 152с.
3. *Холупава,* Л.І. Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль:вучэб.дапам. / Л.І. Холупава, І.М. Грамовіч, Л.Л. Ражкова. – Мн.: Бел.дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008– с. 50–187.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНАКІ ВЕДАЎ

| БАЛЫ | ПАКАЗЧЫКІ АДЗНАК |
|---|---|
| 1 (адзін) | Адсутнасць ведаў па вучэбнай дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; слабыя вакальныя дадзеныя; адмаўленне ад выканання праграмы. |
| 2 (два) | Недакладныя веды па вучэбнай дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; адсутнасць здольнасці да дакладнага інтанавання; нізкі ўзровень культуры выканання вакальных твораў. |
| 3 (тры) | Фрагментарныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту; пасіўнасць на практычных занятках; няўменне арыентавацца ў музычным матэрыяле; вузкі мастацкі кругагляд, невыразныя вакальныя дадзеныя; няўстойлівая ітанацыя; дрэнная дыкцыя; не актыўнае пеўчае дыханне і апора; няўпэўненае выкананне вакальнай партыі; няўмелае валоданне элементамі руху пры раскрыцці сцэнічнага вобразу беларускай народнай песні. |
| 4 (чатыры) | Недастаткова поўны аб’ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; пасрэдныя вакальныя дадзеныя; недастаткова яскравы тэмбр голасу; няўстойлівая інтанацыя; невыразная дыкцыя; няўменне эканомна карыстацца пеўчым дыханнем; недастаткова ўпэўненае выкананне вакальнай партыі; павярхоўнае разуменне паэтычнага тэксту і агульнай драматургіі вакальнага твора; дрэннае валоданне элементамі руху пры выкананні народных песен. |
| 5 (пяць) | Дастатковы аб’ём ведаў у рамках адукацыйнага стандарту; засваенне рэкамендаванай вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне; правільнае выкарыстанне профільнай тэрміналогіі; сярэднія вакальныя дадзеныя; некаторыя недахопы тэмбру голасу; пэўныя дэфекты дыкцыі; няўмелае карыстанне ланцужковым дыханнем; няўменне прыстасоўваць свой голас да агульнай манеры спеваў; дапушчэнне памылак пры выкананні сваёй вакальнай партыі; слабае валоданне дынамічнымі адценнямі; недастатковае разуменне паэтычнага тэксту; няўпэўненае ўвасабленне сцэнічнага вобразу. |
| 6 (шэсць) | Дастаткова поўныя веды ў рамках адукацыйнага стандарту; дастатковыя веды ў аб’ёме праграмы вучэбнай дысцыпліны; актыўнасць на практычных занятках; дастатковы ўзровень |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | культуры выканання вакальных твораў; выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; пасрэдныя вакальныя дадзеныя; цьмяны і невыразны тэмбр голасу; некаторыя памылкі пры выкарыстанні пеўчага дыхання; невыразная дыкцыя; недасканалае ўменне прыстасоўваць свой голос да адзінай манеры выканання; недасканалае валоданне дынамічнымі адценнямі; няпоўнае выкананне патрабаванняў па самастойнай рабоце над вакальным творам. |
| 7 (сем) | Дастаткова поўныя і сістэматызаваныя веды ў аб'ёме вучэбнай дысцыпліны; засваенне асноўнай літаратуры па вучэбнай дысцыпліне і выкарыстанне навуковай тэрміналогіі; недастатковая арыентацыя ў канцэпцыях і кірунках па вучэбнай дысцыпліне; актыўная самастойная работа на практычных занятках; дастатковы ўзровень культуры выканання вакальных твораў; нязначныя недахопы тэмбру голасу; добрая дыкцыя; нязначныя памылкі пры ланцужковым дыханні; уменне спяваць у ансамблі з іншымі партыямі; правільнае разуменне паэтычнага тэксту; не зусім дасканалае ўвасабленне сцэнічнага вобразу вакальнага твору; дастаткова добрае валоданне элементамі народнай харэаграфіі. |
| 8 (восем) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па ўсіх тэмах вучэбнай дысцыпліны; граматнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, асэнсаванае выкладанне матэрыялу; уменне валодаць голасам; уменне арыентавацца ў кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнаўчую адзнаку; актыўная самастойная работа на практычных занятках; дастаткова высокі ўзровень культуры выканання музычных твораў; добрыя вакальныя дадзеныя; дастаткова яскравы тэмбр голасу; чысціня інтанавання; добрая дыкцыя; правільнае пеўчае дыханне і апора; уменне спяваць у ансамблі з іншымі вакальнымі партыямі; упэўненае веданне сваёй партыі ў вакальным творы; уменне дастаткова валодаць народнай мелізматыкай; правільнае разуменне паэтычнага тэксту пры дапамозе якога раскрываецца драматургія вакальнага твору і яго сцэнічны вобраз. |
| 9 (дзевяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае выкладанне матэрыялу; |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| | уменне арыентавацца ў кірунках па вучэбнай дысцыпліне і даваць ім параўнаўчую адзнаку; актыўная самастойная работа на практычных занятках; высокі мастацкі ўзровень выканання вакальных твораў; выдатныя вакальныя дадзеныя; яркі тэмбр голасу; выдатнае інтанаванне; выразная дыкцыя; граматнае валоданне пеўчым дыханнем; адчуванне ансамбля вакальных партый; высокі ўзровень раскрыцця драматургіі народнай песні пры дапамозе акцёрскага майстэрства. |
| 10 (дзесяць) | Сістэматызаваныя, глыбокія і поўныя веды па вучэбнай дысцыпліне ў рамках адукацыйнага стандарту; дакладнае выкарыстанне навуковай тэрміналогіі, граматнае выкладанне матэрыялу; уменне арыентавацца ў кіунках па дысцыпліне і даваць ім параўнаўчую адзнаку; актыўная і творчая самастойная работа на практычных занятках; высокі мастацкі ўзровень выканання вакальных твораў; выдатныя вакальныя дадзеныя; яркі і насычаны тэмбр голасу; выдатнае інтанаванне; выразная дыкцыя; граматнае валоданне пеўчым дыханнем; адчуванне ансамбля вакальных партый; высокі ўзровень раскрыцця драматургіі народнай песні; надзвычай выдатныя акцёрскія здольнасці; выдатнае валоданне пластыкай і элементамі народнага танца. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***Асноўнымі сродкамі дыягностыкі*** з’яўляюцца:

- тэхнічныя залікі, залікі, экзамены (у працэсе якіх вывучаны матэрыял прад’яўляецца ў выглядзе паказа ў класе, канцэртнага выканання),
- тэматычны фестываль-канцэрт;
- конкурс на лепшую інтэрпрэтацыю твора (народная песня);
- чытанне з ліста вакальных партый;
- выканальніцкі аналіз вакальнай партытуры;
- калёквіум (праверка музычнай тэрміналогіі).

Для кантролю і самакантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Вакальны ансамбль” ўжываюцца:

- кантроль зыходных ведаў, уменняў, навыкаў студэнта;
- бягучы кантроль ведаў, уменняў, навыкаў, што атрымліваюцца студэнтам;
- выніковы кантроль атрыманых студэнтам ведаў, уменняў, навыкаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Заняткі па вучэбнай дысцыпліне “Вакальны ансамбль” павінны прывіваць павагу і любоў да народна-песенных традыцый, самастойнасці выканання, развіваць навыкі практычнай работы ў ансамблі.

Важнай часткай вучэбнай дысцыпліны “Вакальны ансамбль” з’ўляецца канцэртна-выканальніцкая дзейнасць, якая дысцыплінуе і стымулюе навучальны працэс. Неабходнай умовай дасягнення прафесійных вынікаў з’яўляецца ўважлівая і актыўная работа студэнтаў і патрабавальнасць выкладчыка да дакладнага выканання яго рэкамендацый на занятках. Яны маюць дакладную зместавую накіраванасць як для студэнтаў, так і для выкладчыка. Якасць гучання і выканальніцкая культура ўдасканальваюцца ў выніку сістэматычных рэпетыцый і канцэртнай дзейнасці. Рэкамендуецца праслухоўванне фоназапісаў народных выканаўцаў, запрашэнне выканаўцаў – носьбітаў традыцыйнага выканальніцтва на рэпетыцыі, якія дапамогуць у засваенні аўтэнтычнай манеры спеваў.

Для найбольш эфектыўнага засваення матэрыялу па дысцыплине “Вакальны ансамбль” ужываюцца вучэбна-даследчыя тэхналогіі, якія прадугледжваюць вывучэнне дыялектных асаблівасцяў рэгіёнау Беларусі, прыёмы вымаўлення паэтычнага тэксту і авалоданне народнай манерай спеваў (мясцовыя пеўчыя традыцыі, перайманне “з голасу”, сувязь спеваў з асаблівасцямі дыялектаў).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ